З.М.Вітошкіна,
ст.выкладчык Беларускага універсітэта культуры

# МЕТОДЫКА РАБОТЫ ПА СТВАРЭННІ ПЛАСТЫЧНЫХ КАМПАЗІЦЫЙ У СПАРТЫЎНА-МАСТАЦКІХ ПРАДСТАЎЛЕННЯХ

Пластыка-харэаграфічнае рашэнне спартыўнага масавага свята патрабуе спецыфічных уменняў, таму што кожны нумар, эпізод, якія развіваюць асноўныя дзеянні, стварaюцца па заданні рэжысёра-пастаноўшчыка свята ці прадстаўлення. Рашаючае значэнне тут набываюць веды пастаноўшчыка і магчымасці вялікай масы людзей, а таксама ўменне шырока выкарыстоўваць гэтыя магчымасці ў пастаноўчай рабоце над кампазіцыямі.

У залежнасці ад задумы прадстаўленне павінна мець пэўны від, гэта значыць рэжысёр можа мяняць форму, перабудоўваючы малюнкі, надаючы ім канкрэтны характар, мяняючы тэмп і рытм рухаў удзельнікаў. Узмацняецца ўражанне сродкамі раптоўнай трансфармацыі касцюмаў ці з'яўленнем у руках удзельнікаў якіх-небудзь каляровых прадметаў, зменай колеру і інш.

Існуюць некалькі этапаў работы пры падрыхтоўцы спартыўна-мастацкага прадстаўлення, якія павінны на практыцы засвоіць студэнты.

Першы этап — шлях да вобразнага рашэння прасторавых кампазіцый.

Згодна сцэнарным умовам, у пачатку вядзецца падбор музычных фрагментаў. На аснове музычнага матэрыялу ствараюцца пластычныя кампазіцыі. Паралельна вядзецца падбор каляровай гамы касцюмаў, аксэсуараў, мастацкага афармлення кожнага нумару. Для рэпетыцыйнай работы метадам кліптаграм ствараюцца чарцяжы, дзе размяркоўваюцца рацыянальныя, лагічна правільныя пераходы з аднаго малюнка ў другі. Гэта неабходна для таго, каб выразна і

разумна, не губляючы рэпетыцыйнага часу, весці перастаноўкі удзельнікаў прадстаўлення.

Другі этап — работа з удзельнікамі прадстаўлення.

Адпаведна кожнаму нумару вядзецца падбор удзельнікаў, пры гэтым улічваюцца ўзровень падрыхтоўкі, пол, узрост. Для работы з удзельнікамі прадстаўлення падбіраюцца харэографы, спартсмены-гімнасты, ваенрукі. З імі праводзіцца семінар, на якім даюцца матэрыялы: фанаграмы, пластычныя кампазіцыі з падрабязным апісаннем рухаў. Толькі пасля гэтага магчыма пачынаць работу з удзельнікамі адпаведных груп на месцах. Згодна графіку рэпетыцый, за два-тры тыдні да прадстаўлення пачынаюцца зводныя рэпетыцыі нумароў і эпізодаў. У гэты перыяд галоўнае — дабіцца выразнага сінхроннага выканання рухаў. Усе фрагменты выступлення аб'ядноўваюцца ў закончанае прадстаўленне.

У працэсе работы над пластычнымі кампазіцыямі вельмі важна метадычна граматна ствараць чарцяжы, дзякуючы якім існуе магчымасць кіраваць удзельнікамі на рэпетыцыях.

Сэнсавы змест малюнкаў кампазіцый садзейнічае стварэнню вобраза прадстаўлення.

Малюнкі падзяляюцца на складаныя і простыя. Складаныя малюнкі (сімволіка) тэматычнага характару — гэта лічбы, герб, сцяг, лозунгі, сонца і інш. Простыя малюнкі адлюстроўваюць геаметрычныя фігуру (лінію, круг, ромб, трохвугольнік і інш). З іх можна ствараць арнамент.

Распрацоўка чарцяжоў вядзецца графічным і фотамакетным метадамі.

Пры праходжанні практыкі студэнты падключаюцца да работы ў якасці асістэнтаў на святах, прысвечаных, напрыклад, юбілеям гарадоў: Мазыр — 840, Мінск — 930, Маладзечна — 600, Кобрын — 700 і інш. На гэтых святах яны выкарыстоўваюць распрацаваную методыку работы, удасканальваюць свае веды і навыкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ